# «Крама з цытатамі» – у бібліятэцы

***У межах «Месяца польскай літаратуры» 13 лістапада ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося адкрыццё літаратурна-мастацкай выстаўкі «Крама з цытатамі. Крылатыя выразы польскай мовы». Сустрэча была прысвечаная менавіта цытатам, даслоўным вытрымкам, думкам выбітных асобаў.***

Аўтарка і ўвасабляльніца ідэі – маладая польская творца Дар'я Мельцажэвіч. Яна не толькі фатограф, але і тэатразнаўца, захапляецца літаратурай і стварае партрэты вядомых людзей, а іх самыя знакамітыя выслоўі размяшчае не толькі на плакатах, але і на рознага кшталту штодзённых рэчах: цішотках, кубках, нататніках, значках, каляндарыках, адзенні і да т.п. Такім чынам дзяўчына спрабуе папулярызаваць чытанне сярод моладзі, прышчапіць цікавасць людзей да культуры й мастацтва. Яна супрацоўнічае са шматлікімі выдавецтвамі, здзейсніла шмат праектаў, што тычацца графікі, распрацоўкі дызайну кніжных вокладак. Гэта выстаўка не першая ў яе жыцці, дзяўчына – лаўрэатка шматлікіх мастацкіх узнагародаў, яе праекты з'яўляюцца на сайтах розных выдавецтваў.

Прадстаўленыя экспанаты створаныя мастачкай цягам апошніх пяці гадоў. Між тым яны прапісаліся ў познаньскай галерэі «Крама з цытатамі», што ўваходзіць у культурную спадчыну Польшчы (дарэчы, яна і ў спісе-топе дзесяці незвычайных крамаў свету).

Сама Дар'я адзначыла, што на выстаўцы прадстаўленыя толькі трыццаць працаў, хаця «Крама» змяшчае блізу 140. Гэта выказванні такіх польскіх паэтаў і празаікаў, як Ян Каханоўскі, Адам Міцкевіч, Генрык Сянкевіч, Марыя Канапніцкая, Станіслаў Лем ды інш., а таксама замежных выбітных асобаў з іншых сфераў. Дызайнерка запрасіла гасцей імпрэзы абавязкова зайсці на сайт «Крамы» – sklepzcytatami.pl, дзе можна пабачыць працы ў больш поўным аб'ёме ды пазнаёміцца з больш цікавай інфармацыяй.



Цэзары Карпіньскі



Раман Матульскі



Аўтар праекта Дар'я Мельцажэвіч (справа)

На мерапрыемства завітала шмат гасцей, сярод якіх былі ўладальніца «Крамы» Барбара Канцэвіч, дырэктар Польскага інстытута ў Мінску Цэзары Карпіньскі ды іншыя. Дырэктар НББ Раман Матульскі сказаў: «Зразумела, што для нашай бібліятэкі выстаўка – гэта найперш выстаўка кніг, але сёння ў нас ёсць магчымасць убачыць кожнага аўтара, а гэта знакамітыя і вядомыя не толькі ў Польшчы, але і далёка за яе межамі людзі. Часта бывае, што трапны сказ, некалькі словаў, цытата могуць сказаць больш за некалькі дзясяткаў старонак. Вельмі кароткі лаканічны выраз іншы раз адлюстроўвае ўсяго чалавека. І вельмі прыемна, што гэтыя цытаты трапляюць у штодзённае жыццё і выходзяць на шырокі прастор». Раман Сцяпанавіч дадаў, што імпрэза незвычайная, бо адбываецца пад час святкавання стагоддзя польскай дзяржаўнасці. Ён павіншаваў польскіх гасцей з гэтай знамянальнай датай, згадаў спрадвечнае яднанне суседак-дзяржаваў – Польшчы і Беларусі.

***Мастацкую экспазіцыю дапоўнілі кнігі з фонду НББ, дзе прадстаўленыя творы пазначаных аўтараў. Гэта дапаможа ўбачыць словы ў кантэксце, а таксама зразумець, чаму тая ці іншая цытата трапіла пад увагу аўтаркі.***

***Надзея ЗУЕВА,***
***фота аўтара***

